формирования и развития горожан. Именно деятельность людей создает содержание городской культуры.

1. *Гуткина, И. М.* Культурное пространство: проблемы и перспективы изучения / И. М. Гуткина // Философия и современность / под ред. Б. В. Устьянова. – Саратов, 2003. – С. 79–87.

2. *Кант, И.* Антропология с прагматической точки зрения / И. Кант // Соч. : в 6 т. – М., 1966. – Т. 6. – С. 349–587.

3. *Манойло, А. В.* Государственная информационная политика в особых условиях : монография / А. В. Манойло. – М. : МИФИ, 2003. – 388 с.

4. *Моль, А.* Социодинамика культуры / А. Моль. – М. : ЛКИ, 1973. – 406 с.

5. *Орлова, Е. В.* Культурное пространство: определение, специфика, структура [Электронный ресурс] / Е. В. Орлова // Аналитика культурологии. – 2021. – Режим доступа: http://www.analiculturolog.ru/journal/archive/item/589-cultural-space-structure-determination-of-specificity.html. – Дата доступа: 12.08.2021.

6. *Финк, Э.* Основные феномены человеческого бытия / Э. Финк // Проблемы человека в западной философии. – М., 1988. – С. 357–402.

7. *Шакирова, Е. Ю.* Общее представление о строении и динамике современного социокультурного пространства / Е. Ю. Шакирова // Вестн. Воронеж. гос. ун-та. – 2013. – № 2. – С. 107–124.

УДК 008:316.7

# ЭВАЛЮЦЫЯ КАНЦЭПЦЫІ КУЛЬТУРНАЙ ІДЭНТЫЧНАСЦІ

***А. Д. Крывалап,*** *кандыдат культуралогіі, дацэнт кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** Артыкул прысвечаны разгляду пытанняў эвалюцыі канцэпцыі культурнай ідэнтычнасці ў сучасных сацыяльна-гуманітарных дысцыплінах: ад псіхалогіі праз сацыялогію да культуралогіі. Апорнай кропкай з'яўляецца канцэпцыя ідэнтычнасці, якую прапанаваў у псіхааналітычным рэчышчы Э. Эрыксан. Далей культурная ідэнтычнасць разглядаецца як прадукт паскарэння глабалізацыі ў канцэпцыі культурнага імперыялізму Д. Томлінсана. Тэкст не спрабуе знайсці ідэальнае вызначэнне культурнай ідэнтычнасці, замест гэтага акрэслівае ў першым набліжэнні траекторыю эвалюцыі выкарыстання тэрміна «культурная ідэнтычнасць» у межах культуралогіі.

**Ключавыя словы:** культурная ідэнтычнасць, эвалюцыя, сацыялізацыя, культуралогія, інкультурацыя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# EVOLUTION OF THE CONCEPT OF CULTURAL IDENTITY

***A. Krivolap,*** *PhD in Culture Studies, Associate Professor of the Department of Culturology of the Educational Establishment «The Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The article examines the evolution of concepts of cultural identity in modern socio-humanitarian disciplines: from psychology via sociology to cultural studies. The fulcrum is the concept of identity that was found in the psychoanalytic things of E. Erickson. Further, cultural identity is seen as the product of accelerating of global application in J. Tomlinson's concept of cultural imperialism. This text does not attempt to seek a perfect definition of cultural identity, but instead is outlined in the first approximation the trajectory of the evolution through the term «cultural identity» within cultural studies.

**Keywords:** cultural identity, evolution, socialization, cultural studies, inculturation.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тэрмін «ідэнтычнасць» стала ўвайшоў у паняційны апарат сацыяльнагуманітарных дысцыплін. Існуе шмат даследаванняў наконт магчымых узроўняў, на якіх і адбываецца праца з ідэнтычнасцю. Для дадатковай тэрміналагічнай строгасці выкарыстоўваюцца наступныя прыметнікі для ўдакладнення разумення ідэнтычнасці: індывідуальная ці калектыўная, этнічная ці нацыянальная, прафесійная ці культурная і інш. Да сярэдзіны XX ст. даследаванні ідэнтычнасці не былі мэйнстрымам для сацыяльных дысцыплін, а хутчэй з'яўляліся чымсьці перыферыйным, саступаючы месца больш актуальным тэмам. Але становішча пачало мяняцца пасля таго, як Э. Эрыксан у межах псіхааналітычнага падыходу абгрунтаваў значнасць і неабходнасць выкарыстання менавіта канцэпцыі ідэнтычнасці для псіхалогіі. Затым гэта было перанесена на сацыялогію і культуралогію. Менавіта праз выкарыстанне ідэнтычнасці магчыма знайсці вырашэнне праблемы ўзаемадзеяння індывіда і грамадства, ці больш шырока гэта можна акрэсліць як цяжкасці спалучэння сацыяльных дзеянняў індывідаў з сацыяльнымі структурамі. Гэта можна сфармуляваць у выглядзе пытання: якім чынам практыка індывідаў трансфармуе сацыяльныя структуры, да якіх гэтыя індывіды непасрэдна належаць? І адказ на яго неабходна шукаць з дапамогай культурнай ідэнтычнасці.

Артыкул прысвечаны разгляду пытання эвалюцыі выкарыстання тэрміна «культурная ідэнтычнасць» у межах культуралогіі. Прапанаваная Э. Эрыксанам «эпігенетычная дыяграма» [2, с. 103], якая апісвае восем стадый ідэнтычнасці асобы, грунтуецца на тым, што ідэнтычнасць не з'яўляецца чымсьці, дадзеным чалавеку ад нараджэння. Хутчэй наадварот, жыццё кожнага чалавека праходзіць праз шэраг крызісаў ці развілак, калі магчыма зрабіць выбар ці адмовіцца ад далейшага персанальнага развіцця. Менавіта паслядоўнасць такіх крызісных сітуацый і дазваляе чалавеку стаць самім сабой, сфарміраваць уласную непаўторнасць і

індывідуальнасць, пазбегнуць рэгрэсу і затрымкі ў развіцці. Можна сказаць, што, пачынаючы з даследаванняў Э. Эрыксана, пытанні ідэнтычнасці паступова атрымоўваюць усё большую ўвагу даследчыкаў, і не толькі ў межах псіхалогіі. Пабудова культурнай ідэнтычнасці таксама патрабуе шэрагу складаных выбараў адносна таго, з якой культурай атаясамліваць сябе, якія культурныя практыкі засвойваць, а ад якіх радыкальна адмаўляцца і выціскаць са свядомасці.

Сярод шматлікіх падыходаў да канцэптуалізацыі ідэнтычнасці магчыма вылучыць «тры асноўныя кірункі развіцця тэорыі: канструктывісцкі, постмадэрнісцкі і інтэракцыяністкі» [1, с. 29]. Кожны з іх закранае пытанне культуры як складніка ідэнтычнасці, і ўсе яны ў пэўнай ступені з'яўляюцца прадуктам ці вынікам другой паловы XX ст. Пры гэтым усе яны досыць крытычна ставяцца да наступстваў глабалізацыі. З аднаго боку, глабалізацыя ўспрымаецца як пагроза лакальным культурам, форма татальнай уніфікацыі і культурнага імперыялізму. Але з іншага – культурная ідэнтычнасць можа разглядацца як «прадукт, а не ахвяра глабалізацыі» [5, с. 269]. Менавіта наяўнасць працэсаў глабалізацыі дазваляе разважаць пра лакальныя адметнасці, унікальны індывідуальны досвед і эмацыянальныя перажыванні. Да пачатку гэтага працэсу ідэнтычнасць успрымалася як нешта дадзенае раз і назаўсёды: пол, расавая прыналежнасць, родная мова, этнічнасць, сямейныя сувязі і сацыяльная група. Усе гэтыя адметнасці ўспрымаліся як нешта нязменнае і ўтваралі культурную ідэнтычнасць як асобы, так і лакальнай супольнасці, да якой гэта асоба належала. Фактычна культурную ідэнтычнасць кожны чалавек атрымоўваў у спадчыну, яе памер і змест залежалі ад месца нараджэння. «Ідэнтычнасць, як і мова, была не проста апісаннем культурнай прыналежнасці – гэта быў свайго роду калектыўны скарб мясцовай супольнасці» [5, с. 269]. Але гэты скарб дастаткова крохкі і ўспрымальны да знешняга ўздзеяння. Метафарычна гэта можна параўнаць са шклянымі вырабамі для захоўвання чаго-небудзь (слоікі, пляшкі, келіхі і інш.), якія напаўняюцца лакальнымі культурнымі сэнсамі. Аднак працэс глабалізацыі патрабуе ўніфікаванага і стандартызаванага «шклянага посуду». І ў гэтым сэнсе лакальныя культурныя ідэнтычнасці трапляюць у зону рызыкі.

З іншага пункту гледжання, глабалізацыя не толькі разбурае наяўныя культурныя ідэнтычнасці, але і спрыяе ўтварэнню новых. Гэта тая сіла, якая пашырае магчымасці для канструявання і пашырэння выкарыстання канцэпцыі культурнай ідэнтычнасці, што дазваляе разважаць пра ідэнтычнасць як пра культурную мяккую сілу ў дачыненні да трансфармацыі ўласнага грамадства ці іншых культур. Недастаткова ведаць уласныя адметнасці і адрозненні ад іншых асоб, недастаткова адчуваць прыналежнасць да пэўнай супольнасці, каб не стаць ахвярай глабалізацыі. Часам у якасці выратавання выкарыстоўваецца тэрмін «нацыянальная ідэнтычнасць». Але гэта не толькі не вырашае праблемы, звязаныя з гла-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

балізацыяй, а хутчэй толькі ўскладняе іх вырашэнне. Канструктывісцкі характар ідэнтычнасці «выклікае праблемы ў гегемоніі нацыянальнай дзяржавы з-за пачуцця культурнай прыхільнасці яе насельніцтва» [3, с. 271], калі ў людзей з'яўляецца магчымасць будаваць уласную ідэнтычнасць без дакладнай прывязкі да пэўнай тэрыторыі. Грамадзяне свету, жыхары планеты Зямля і іншыя касмапалітычныя ідэнтычнасці зараз не ўспрымаюцца як нешта абсалютна недасяжнае. Наадварот, сучасная культурная ідэнтычнасць усё менш вызначаецца фізічным месцазнаходжаннем асобы, якое падмяняецца адлегласцю, паспяхова пераадоленую сучаснымі сродкамі тэлекамунікацыі. Калі ў мінулыя часы наша ўласнае цела было сведчаннем і доказам пэўнай культурнай ідэнтычнасці, то зараз нам патрэбна пасрэдніцтва самых разнастайных тэхналагічных прылад каб сцвердзіць уласнае існаванне. Аднак доступ да гэтых сродкаў не з'яўляецца абсалютна свабодным і ўсеагульным. Хутчэй наадварот – гэта тое, што падзяляе людзей і дазваляе ствараць новыя іерархіі.

У брытанскіх культурных даследаваннях пытанні культурнай ідэнтычнасці закранаюцца ў кантэксце дыяспары ці іншых маргінальных суполак. І асноўным пытаннем для вывучэння культурнай ідэнтычнасці ў гэтым кантэксце будзе пытанне ўлады і дамінавання. Якім чынам адна культура можа падпарадкаваць сабе іншых? Чаму прадстаўнікі дыяспары захоўваюць сваю культурную ідэнтычнасць? Напрыклад, выхадцы з Індыі, якія стала і працяглы час жывуць у Вялікабрытаніі, не становяцца брытанцамі, але пры гэтым не з'яўляюцца і «сваімі» для жыхароў Індыі.

Такім чынам, канцэпцыя культурнай ідэнтычнасці выходзіць за межы дыялогу культур і пераходзіць на ўзровень прынцыповых пытанняў утварэння грамадства, сацыяльнай няроўнасці, падпарадкавання і дамінавання: «Важнае падабенства паміж фарміраваннем этнічнай і культурнай ідэнтычнасці датычыцца пытання дамінавання. Паколькі розныя этнічныя, расавыя і культурныя групы ўступаюць у кантакт паміж сабой, гэтыя групы нязменна адрозніваюцца паміж сабой статусамі і ўладай» [3, с. 287]. Выкарыстанне тэрміна «культурная ідэнтычнасць» дазваляе не толькі даследаваць наяўныя сацыяльна-культурныя сувязі ў супольнасці, але і тлумачыць невідавочныя заканамернасці і нефармальныя сувязі ў грамадстве. Падобнае разуменне вельмі блізка па сваім гучанні да посткаланіяльных даследаванняў, калі «культурная ідэнтычнасць як агульная сукупнасць спосабаў жыцця сярод групы і ўключае ў сябе тое, што перадаецца ад аднаго пакалення да наступнага» [4, с. 3]. Іншымі словамі, культурная ідэнтычнасць – гэта ўсе аспекты практыкі, калі кожнае дзеянне, кожны крок, кожнае выказванне мае некалькі ўзроўняў сэнсу і можа быць прыдатным да інтэрпрэтацыі і тлумачэнняў, калі першапачатковае разуменне ідэнтычнасці як адметнасці індывіда распаўсюджваецца на калектыўную, супольную практыку. Зразумела, што гэта закранае пытанні індывідуалізму і калектывізму ў культурах, але рана ці позна ізноў вядзе да пытанняў падпарадкавання і размеркавання сімвалічнай улады.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Індывід падпарадкоўваецца грамадству, ці грамадства залежыць ад волі індывіда? Напэўна, у большасці выпадкаў індывідуальнае падпарадкоўваецца супольнаму праз тэхнікі сацыялізацыі, калі ў працэсе інкультурацыі індывіды засвойваюць нормы, мову, каштоўнасці і практыкі дамінуючай культуры ў абыходжанні з культурнымі сімваламі: ад татуіровак і татэмаў да аватараў і нікнэймаў – усё залежыць ад ступені развіцця супольнасці.

Аднак нават гэты працэс, які мае тысячагадовую гісторыю, не з'яўляецца бездакорным. Крызіс ідэнтычнасці XX ст. застаецца нявырашаным дагэтуль. Множнасць ідэнтычнасцей і сацыяльных роляў, празрыстасць культурных межаў і неразуменне традыцый, непрыманне рацыянальнасці і страх перад ірацыянальным у культуры – з аднаго боку, усё гэта стварае дадатковыя цяжкасці ў разуменні чалавекам самога сябе, а з іншага – даказвае актуальнасць і неабходнасць даследаванняў сферы культурнай ідэнтычнасці, дзе па-ранейшаму пытанняў больш, чым адказаў. Звычаі і традыцыі – гэта артэфакты культурнага мінулага. Каб зразумець кожны рытуал і яго месца ў дадзенай супольнасці, неабходна зразумець сувязь паміж ім і цэлым шэрагам іншых сацыяльна-культурных практык, якія ўтвараюць адну вялікую сістэму, назва якой – культура. Таму культурную ідэнтычнасць магчыма зразумець і даследаваць толькі з улікам яе стасункаў з гэтымі сеткамі сэнсаў і ў пэўным кантэксце.


1. *Полякова, Н. Л.* «Идентичность» в современной социологической теории / Н. Л. Полякова // Вестн. Москов. ун-та. Сер. 18, Социология и политология. – 2016. – № 4. – С. 22–42.

2. *Эриксон, Э.* Идентичность: юность и кризис / Э. Эриксон. – М. : Флинта : МПСИ : Прогресс, 2006. – 352 с.

3. *Jensen, L. A.* Globalization and Cultural Identity / L. A. Jensen, J. J. Arnett, J. McKenzie // Handbook of Identity Theory and Research. – New York, 2011. – P. 285–301.

4. *Loughran, S.* Cultural Identity, Deafness and Sign Language: A Postcolonial Approach / S. Loughran // LUX: A Journal of Transdisciplinary Writing & Research from Claremont Graduate University. – 2013. – Vol. 2. – № 1. – P. 1–9.

5. *Tomlinson, J.* Globalization and Cultural Identity / J. Tomlinson // The Global Transformations Reader: An Introduction to the Globalization Debate. – Cambridge, 2003. – P. 269–277.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ